УДК94(476):393

# ПЕКЛА Ў КАТАЛІЦКАЙ І ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКОЎНЫХ ПРОПАВЕДЗЯХ У ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ У КАНЦЫ XVI – XVIII ст.

Стахно Ніна Валер'еўна
аспірант кафедры гісторыі Беларусі старажытных часоў і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(г. Мінск, Беларусь)

*Дадзены артыкул прысвечаны праблеме фарміравання ў шляхецкім асяроддзі Вялікага Княства Літоўскага ўяўленняў пра патойбаковы свет і пекла. Аўтар намагаецца выявіць агульныя і адрозныя рысы ў пропаведзях каталіцкай і праваслаўнай цэркваў, а таксама вызначыць прычыны разыходжанняў і даць ацэнку іх уплыву на светапогляд тагачаснай шляхты.*

Перыяд канца XVI – XVIII ст. быў для рэлігійнай гісторыі Вялікага Княства Літоўскага надзвычайна складаным. Да дамінацыі імкнулася каталіцкая царква, але сваё пачэснае месца адваёўвала ўніяцтва, да таго ж, нікуды не падзеліся і праваслаўе з рознымі плынямі пратэстантызму. Усе гэтыя хрысціянскія канфесіі актыўна звярталіся да сваіх прыхаджан з амбонаў касцёлаў, цэркваў, збораў. Звярталіся яны з рознымі пытаннямі, са своеасаблівымі трактоўкамі тэкстаў Святога Пісання, але нязменным заставалася адно – зварот да галоўнага рычага націску і галоўнага сродку абмежавання і ўтаймавання – зварот да страху. У першую чаргу, да страху вечнага патаплення і згубы мажлівасці выратаваць сваю вечную душу. У нашай працы мы засяродзілі ўвагу на апісаннях пекла ў рэлігійнай літаратуры дзвюх хрысціянскіх канфесій. За мэту мы паставілі сабе, параўнаць апісанні пекла і выявіць як кропкі судатыкнення, так і разыходжанні, ва ўяўленнях католікаў і праваслаўных.

Пекла ў каталіцкім касцёле, дзякуючы яскравым эпітэтам прапаведнікаў, ва ўяўленні людзей было надзвычайна страшным. Яно, за звычай, выяўлялася як велізарная цёмная вязніца поўная дэманаў і агню, месца катаванняў. У аснову каталіцкіх апісанняў пекла былі пакладзены Бачанні св. Паўла, які атрымаў магчымасць наведаць царства Сатаны. Блукаючы па гэтым страшным месцы, апостал бачыў жудасныя рэчы: вогненнае дрэва, на якім віселі грэшнікі, гарачыя печы і глыбокія калодзежы [1, s. 94].

Калі казаць аб лакалізацыі пекла, то сарматы-католікі лічылі, што яно знаходзіцца ў нетрах зямлі, у самай яе сярэдзіне: "w samym środku ziemi te miejsca znajdują się, w głębią ziemi idąc, mil 3245 i pół mili" ("у самым цэнтры зямлі тыя месцы размешчаны, у нетрах зямлі за 3245 з паловай мілі"). Месца "ўваходу" ў пекла знаходзілася на сіцылійскіх выспах [2, s. 39]. У гэтым далёкім і глыбокім месцы пакутаў няма святла, усё агорнута туманам і дымам, з-за надзвычайнай колькасці грэшнікаў і нячысцікаў, якія іх катуюць, там вельмі цесна; пануе непрыемны пах серы, там адсутныя смех і весялосць, а чутныя толькі плач і скрыгатанне зубоў, туга і смутак усеабдымныя. Грэшнікі вымушаны цярпець ад вечнай смагі і голаду, якія нельга ніякім чынам наталіць.

У пекле незлічоная колькасць відаў катаванняў, грэшнікі там пакутуюць ад найгоршых захворванняў, кожная іх частка не застаецца свабоднай ад болю, але самым галоўным пакараннем з'яўляюцца пакуты сумлення [3, s. 209]. Традыцыйна ў пекле мы знаходзім дванаццаць пякельных катаванняў. Кожная катэгорыя грэшнікаў мае ўласны від пакарання. Пяць тыпаў пакутаў прызначаліся для тых, хто ўсё жыццё заставаўся ў палоне пачуццяў: зроку, слыху, абаняння, смаку і дотыку, а астатнія сем адпавядалі адплаце за смяротныя грахі: ганарыстасць, пажаду, зайздрасць, абжорства, сквапнасць, гнеў і ляноту [4, s. 85-91].

Адным з галоўным атрыбутаў пекла быў вечны агонь. Ён не меў ачышчальнай сілы і мусіў гарэць увесь час пры любых абставінах. Наступная характарыстыка геены вогненнай – вечнасць пакарання. Для таго, каб падкрэсліць, наколькі доўга будуць адбывацца катаванні, прапаведнікі супрацьпастаўлялі кароткасць жыцця чалавека з бязмежнасцю вечнасці [1, s. 96]. Прыводзіліся наступныя метафары: "Gdyby była karta tak długa, żeby opasać mogła wszytek okrąg świata, niechżeby kto miliony na niej pisał, tedy tak długa liczba summowana, nawet minuty nie utarłaby wieczności" ("Калі б быў аркуш, такі доўгі, што ён мог апаясаць усю акружнасць свету, няхай бы мільёны на ім напісалі, то выніковая лічба, нават не дасягнула б хвіліны ў параўнанні з вечнасцю") [2, s. 51].

У праваслаўныхідэя адплаты за грахі была распрацавана яшчэ ў візантыйскім апакрыфічным творы "Хаджэнне Багародзіцы па пакутах", але знайсці разбудаванае апісанне пекла і катаванняў, з якіх там церпяць душы ў праваслаўных пропаведзях практычна немажліва.

У тых сціплых апісаннях, якія закранаюць тэму месца вечнай пакуты, яно малюецца або ў выглядзе пашчы фантастычнага звера Левіяфана – падобнага да змяі ці з галавой льва – альбо ў выглядзе пячоры, дзе пад замком сядзяць няшчасныя душы грэшнікаў. Гэта цёмнае, смараднае месца [5, арк. 10-10 адв.], дзе пануюць вечны незгасальны агонь і цялесныя пакуты [6, с. 56].

Ступень катаванняў, іх форму і цяжкасць вызначае Бог. Галоўнае пакаранне, на якое была асуджана душа – гэта не фізічныя пакуты, а немажлівасць ўбачыць Бога і патрапіць на нябёсы, другое пакаранне – згрызоты сумлення, якое нагадвае чалавеку пра згублены шанец быць пазбаўленым [7, с. 144-149].

Каб данесці тое, наколькі страшныя пакуты чакаюць на грэшнікаў, прапаведнікі для дэманстрацыі прыводзілі гісторыю Лазара, які вандраваў па замагільным свеце, а пасля таго як уваскрос, 30 гадоў не пасміхаўся, так яго ўразілі пякельныя пакуты.

Але пакуты ў пекле для праваслаўных былі не беспрасветнымі. Дзякуючы міласэрнасці Божай Маці палёгка ў пякельных катаваннях наступала ад Вялікага Чацверга да дня Пяцідзясятніцы.

Важным было і пытанне ці трэба маліцца за душы грэшнікаў? У трэбніку 1646 г. адзначаецца, што гэтага рабіць не трэба, бо такія паводзіны могуць абразіць Бога і быць сведчаннем чалавечай пыхі і самаўпэўненасці [8, с. 762]. Але ці можна быць упэўненым, што душа будзе патоплена і скіравана ў пекла? Канешне, не. Акрамя таго, прапаведнікі для ўзмацнення веры выкарыстоўвалі прыклады бязмежнай міласэрнасці Бога, які можа выратаваць як і апошняга грэшніка, так і паганца. Такім чынам, спрабавалі заахвоціць прыхаджан ва ўдзеле ў развіцці памінальных практык, не залежна ад знешніх абставінаў [9, с. 182–183].

Такім чынам, мы можам вызначыць шэраг блізкіх момантаў у адносінах да пекла ў католікаў і праваслаўных. Першым і, напэўна, самым важным момантам з'яўляецца вызначэнне галоўнага пакарання – немажлівасць быць з Богам і нейкім чынам выкупіць свае грахі. Таксама значная роля ў абедзвюх канфесіях адводзіцца маральным пакутам – згрызотам сумлення за здзейсненыя грахі. Неад'емным атрыбутам абодвух карцін з'яўляецца вагонь, які не мае ачышчальнай сілы. Значна больш выразнымі выяўляюцца адрозненні. Калі каталіцкія прапаведнікі канцэнтраваліся на разгалінаваных апісанні месца знаходжання пекла, яго пабудове, а таксама на тым, што чакала патопленую душу, то праваслаўныя прапаведнікі значна менш надавалі яму ўвагі, і, увогуле, радзей карысталіся апісаннем пекла ў сваіх працах. У праваслаўных пекла выкарыстоўваецца не для застрашэння, да людзей не звяртаюцца як да патэнцыйных насельнікаў пекла. Наадварот, звычайна пекла апісваецца ў сувязі з гісторыямі вызвалення Богам грэшнікаў з пекла, для таго, каб прадэманстраваць міласэрнасць Бога і падмацаваць веру людзей ні ў якім выпадку не губляць надзеі на збаўленне. Акрамя таго, важным момантам з'яўляецца дзейнасць Багародзіцы, дзякуючы чаму грэшнікі атрымліваюць часовую палёгку ў сваіх пакутах.

## Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Kwapińska, A. Mogliśmy być zbawieni, a nie chcieliśmy… O wizji piekła w literaturze religijnej XVII – XVIII wieku // Człowiek wobec śmierci na przestrzeni dziejów / red. nauk. Jacek Kordel, Maksymilian Sas. – Warszawa : Studenckie Koło Naukowe Historyków Uniwersytetu Warszawskiego, 2011. – S. 91–98.
2. Węgrzynowicz, A. Kazan niedzielnych księga trzecia albo Nauki o czterech rzeczach ostatecznych przez całoroczne niedziele rozłożone / napisana przez X. Antoniego Węgrzynowicza [...] y do druku [...] podana roku [...] 1714 / Antoni Węgrzynowicz. – Warszawa : w drukarny OO Scholarum Piarum, [1714]. – 447 s.
3. Horolt, S. Anatomia duchowna w troiakim wieku życia ludzkiego przy powadze Pisma S. Doktorow SS. uczyniona autentycznemi historyami utwierdzona z przydatkiem niektorych reflexyi ku przygotowaniu się na dobrą śmierć przez X. M. Stanisława Horolta Prow. Polskiey Oyca na ten czas Kustosza Lubelskiego zakonu S. Franciszka minorum Conventualium napisana y do druku podana. Za dozwoleniem duchowney zwierzchności w R. P. 1730 / Stanisław Horolt. – Poznan : w drukarni Przesław. Akademii, [po 12 III?] 1730.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

4. Bolesławiusz, K. Przeraźliwe echo trąby ostatecznej / Klemens Bolesławiusz, wydał Jacek Sokolski. – Warszawa : Instytut Badań Literackich, 2004. – 252 s.
5. Karpowicz, L. Kazanie na pogrzebie Kniazia Wasila Wasilewicza Haliczyna w Cerkwi Brackiey Wileńskiey ś. Ducha w rocku 1619 / Leonty Karpowicz. – Wilno, 1619.
6. Возняк, М. С. Причинки до студій над писаннями Лаврентія Зизанія / Записки наукового товариства ім. Шевченка, 1908 р. – Т. 83. – С. 31–88.
7. Транквиллион-Ставровецкий, К. Перло многоценное / Кирилл Транквиллион-Ставровецкий. – Могилев : В друкарни Максима Вощанки, 1699. – 235 с.
8. Евхологіон, албо Молитвослов, или Требник, имѣяй в себѣ церковная различная послѣдованія, іереом подобающая. – Кіеў : Друкарня Пячэрскай лаўры, 1646. – 1757 с.
9. Галятовський, І. Ключ розуміння / підготувала до видання І. П. Чепіга.– Київ : Наукова думка, 1985.– 445 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова